# Школьная планета

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ! № 2 (32) КАСТРЫЧНІК 2016**

*Выданне ДУА “Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно” Мінскай вобласці*
















***Фота Ірыны Маркевіч***

# 550 кіламетраў і гімн пад зоркамі

Нам не спалася ўсю ноч, ляглі мы спаць у гадзіну, хоць і ведалі, што ўставаць у чатыры. Прачнуліся не без цяжкіх адчуванняў, але стараліся трымацца бадзёрымі. У шэсць гадзін трыццаць хвілін раніцы мы былі каля ***Мінска***, сустракалі ўзыход цудоўнага сонца. Было цікава назіраць: наколькі хутка падымаецца сонца. Планаў у нас было шмат на гэты дзень... Прыехалі мы ў ***Мір*** - гарадскі пасёлак у Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці на рацэ Міранка - каля дзевяці гадзін. Перш за ўсё шукалі, дзе прыпаркавацца, былі шчыра здзіўлены вялікай колькасцю людзей, машын, матацыклаў і намётаў. Затым, праехаўшы крыху па вуліцах Міра, усё ж знайшлі месца для паркоўкі, пакінулі матацыкл і пайшлі непасрэдна да ***замкавага комплексу «Мір»***, які ўнесены ў спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Так як мы прыехалі некалькі раней, то вырашылі прайсціся і аглядзецца. Мы з татам дзівіліся прыгажосці замка і яго краявідаў. Велізарнае ўражанне пакінулі паркі, у адным з іх стаіць ***усыпальніца Святаполк-Мірскіх***. Вырашыліся ўсё ж пабываць і ўнутры, купілі квіткі, яшчэ трохі пачакалі і апынуліся ў самым замку. Слоў не было, зрэшты як і цяпер. Гэта трэба бачыць... Мяне асабліва ўразілі лесвіцы (яны вельмі крутыя, але нават высокі чалавек не стукнецца галавой, так сканструяваны), бальная зала, у якой, на жаль, нельга было фатаграфаваць. Там было цудоўнае люстэрка, раяль, усё ў беласнежна-залатых адценнях. З адной з вежаў адкрываўся прыгожы від на сам гарадскі пасёлак. Вінны склеп, вязніца таксама не пакінулі нас абыякавымі.



Наступным нашым прыпынкам стаў ***Турэц*** (Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць). ***Свята-Пакроўская царква*** ў вёсцы Турэц размяшчаецца ў самым цэнтры населенага пункта, каля крамы, на значным узвышэнні, і таму бачная здалёку. Нездарма ж яшчэ ***Янка Брыль*** пісаў аб прыгажосці тутэйшых мясцін! Тут мы вырашылі крыху адпачыць, купілі паесці і агледзелі царкву, у якой на той момант ішла служба.

Цікава, што гэтая царква – не проста помнік архітэктуры, а своеасаблівая людская энцыклапедыя: колькі пакаленняў, колькі людзей і лёсаў прайшло праз гэтыя сцены... Колькі таямніц, слёз і радасці памятаюць яны... Напрыклад, у 1909 годзе ў касцёльнай метрычнай кнізе быў зроблены запіс аб вянчанні ў гэтай царкве адной пары. Нявеста Варвара Фёдараўна раней ужо была замужам і нават мела траіх дзяцей, жаніх Іван Міхайлавіч Фёдараў быў на

сем гадоў маладзейшы за нявесту. Сёння Іван Міхайлавіч нам больш вядомы як ***Янка Маўр*** – беларускі пісьменнік, аўтар аповесці «Палескія рабінзоны» . У гады савецкага атэізму храм не закрываўся. Звыш таго, сюды звозілі іконы і царкоўнае начынне з бліжэйшых храмаў, якія былі зачынены.



Наступным нашым пунктам, у якім мы былі проста праездам, былі ***Карэлічы***. Далей мы рушылі ў першую сталіцу Вялікага Княства Літоўскага, адзін з самых старажытных гарадоў на беларускай зямлі - ***Навагрудак***. Патрапіўшы ў горад мы не маглі зразумець куды нам ехаць, настолькі шмат было шляхоў-дарог. Ён размяшчаецца на ўзвышшы, таму нашаму матацыклу прыйшлося напружана папрацаваць. Вельмі цікавы і яркі горад. Цудоўны парк, у якім дзяцей катаюць на імправізаваным паравозіку. Парк знаходзіцца каля ***«кургана неўміручасці»***, насыпанага ў гонар ***Адама Міцкевіча***, і руінаў ***замка Міндоўга***. Ад замка на многія кіламетры адкрываецца цудоўная панарама на прыгарадныя далі і лясы. Не выпадкова Наваградчыну называюць ***"беларускай Швейцарыяй"***. Маляўнічасць гэтага кутка натхняла многіх паэтаў.

***Адам Міцкевіч*** - ураджэнец Навагрудчыны. Пагорак у яго гонар быў закладзены 27 мая 1924 года.



Пастанову пра гэта, напісаную на пергаменце, змясцілі ў алавяную шкатулку і забетаніравалі ля падножжа будучага помніка. Першую жменю зямлі на месца будучага кургана кінуў кіраўнік Міцкевічаўскага камітэта прафесар Станіслаў Вайцяхоўскі, а затым — жыхары Навагрудчыны, Літвы і Польшчы. Так пачаў расці пагорак у Наваградку. На працягу 7 гадоў сюды прыязджалі землякі Адама Міцкевіча, а таксама простыя прыхільнікі яго таленту, каб прывезці на Наваградчыну трохі зямлі са сваёй радзімы. Хто не мог прыехаць, дасылаў яе поштай: «Навагрудак. Зямля для ўшанавання памяці Адама Міцкевіча». Курган рос і рос. Чэрвень 1830 года быў абвешчаны ***«Міцкевічаўскімі днямі»***. Улады абвясцілі аб хуткім завяршэнні будаўніцтва. Гэта рашэнне выклікала наплыў турыстаў у Навагрудак — кожны хацеў паспець прыняць удзел ва ўзвядзенні кургана. Некаторыя сем'і да гэтага часу захоўваюць памятны значок аб гэтай падзеі, які ўручаўся кожнаму ўдзельніку. 28 чэрвеня 1931 года пасля службы ў Фарным касцёле, дзе хрысцілі Адама Міцкевіча, помнік

быў урачыста перададзены гораду. З той пары стала традыцыяй праводзіць у Наваградку штогадовыя святы песні і танца, прысвечаныя Адаму Міцкевічу. Сярод мясцовых жыхароў жыве паданне: менавіта ў гэтыя дні душа паэта пакідае кракаўскі Вавеэль і накіроўваецца ў Навагрудак, каб з кургана любавацца роднымі прасторамі.



На вуліцы стаяла спякота, але мы цярпліва ехалі далей у мотакуртках, таму што бяспеку ніхто не адмяняў!!! Неўзабаве павеяла прахалодай, і мы апынуліся ля ***возера Свіцязь***, паходжанне якога ахутана таямніцамі і легендамі. Людзей цемра, стаць няма дзе, экіпаж ДПС рэгуліравала рух каля возера. Мы ўздыхнулі і працягнулі шлях у бок ***Гарадзішча*** (Брэсцкая вобласць). Гэты населены пункт нам добра знаёмы, тут нарадзілася мая бабуля. Мы спыніліся для адпачынку каля возера, пад векавымі ліпамі. Тут калісьці быў стары вадзяны млын, у якім працаваў мой прадзед Пётр Рыгоравіч. Адпачыўшы некалькі гадзін, спаласнуўшыся халоднай вадой, мы вырашылі заехаць на могілкі. Вечарэла... Вячэрняя прахалода адкрыла ў нас другое дыханне, і мы, параіўшыся, вырашылі не заставацца на начлег, хоць у нас усё было падрыхтавана, а ехаць дадому. Падумаеш, 250 кіламетраў…

Заправіўшыся да поўнага бака, у 19:30 мы выехалі дадому. Апошнія прамяні сонца былі нашымі спадарожнікамі. Дарога ***Баранавічы-Мінск*** была загружанай, асабліва бліжэй да сталіцы. Матацыклісты, якія праязджалі міма, віталі нас узняццем рукі. Калі мы спыніліся апрануцца цяплей, адзін з матацыклістаў, скінуўшы хуткасць, спытаў жэстам ці ўсё ў нас у парадку і,пераканаўшыся, што ўсё добра, паехаў далей.

Мы былі вельмі стомленыя, цямнела. Каб неяк развеяцца, я махала аўтамабілістам і іх пасажырам, яны махалі ў адказ. Усім было весела. У ***Чэрвені*** нас сустрэла ноч. Мы спыніліся ля гарматы, на ўездзе. Апранулі дажджавікі і тут нас пачало прабіваць на смех – гэта поўная стомленасць. Я прапанавала тату паставіць палатку прама тут і паспаць. Тата сказаў: «Спаць будзем дома!» І мы паехалі...Тата ўсю дарогу правяраў, ці не сплю я, а я ўжо пачала драмаць. Каб не заснуць, я стала спяваць песні і, сама таго не заўважаючы, заспявала ***гімн Беларусі***. У зорным небе шукала Вялікую Мядзведзіцу, неба было дзіўна прыгожым. У прамежках паміж песнямі і зоркамі, тармасіла тату, каб не заснуў. Пры доўгай, манатоннай яздзе можна заснуць нават на матацыкле. Я гэта ведаю. Раптам з'явіліся агні роднага горада і мы закрычалі "ўра". Каля дванаццаці мы ўжо стаялі ў сябе ў двары.

***09.08.2015 была наша першая працяглая паездка. Прыкладна за 19 гадзін мы праехалі 550 кіламетраў, пабывалі ў трох абласцях, такое не забываецца!!!***

***Марыя Власюк, фота аўтара***

Дом, у якім утульна ўсім!
berezino2.school.by vk.com/club59543714 № 32, кастрычнік 2016 г.

Знакамітыя выпускнікі

# Чалавек справы



**АЛЯКСАНДР АЛЯКСЕЕВІЧ ПУХАВЫ**
*Выпускнік 1967 года.*

*Нарадзіўся ў 1950 годзе ў горадзе Беразіно Мінскай вобласці. У 1972 годзе скончыў Беларускі політэхнічны інстытут.*

*Працаваў механікам механізаванай калоны трэста " Западэлектросетьстрой ", прайшоў шлях ад інжынера-тэхнолага да галоўнага інжынера Барысаўскага завода "Автогидроусилитель". Быў першым намеснікам генеральнага дырэктара Беларускага аб'яднання па вытворчасці аўтамабільных агрэгатаў (Барысаў). З 1997 года быў дырэктарам завода "Автогидроусилитель".*

*З 20 сакавіка 2002 па 2013 год - генеральны дырэктар РУП "Мінскі трактарны завод".*

*Па выніках 2003 года прызнаны лепшым кіраўніком. Лаўрэат конкурсу «Чалавек Справы-2004» у намінацыі «За актыўнае садзеянне развіццю аграрнага сектара Беларусі». Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, двойчы (1981, 2009).*

— За амаль адзінаццаць гадоў, якія мы прапрацавалі разам, — так звярнуўся да працаўнікоў МТЗ Пухавы Аляксандр Аляксеевіч, — мы зрабілі нямала. Калектыву беларускіх трактарабудаўнікоў ёсць чым ганарыцца. МТЗ сёння — флагман ў трактарабудаванні. Яго прадукцыя прызнана ва ўсім свеце. Ён і будзе такім заставацца, але ўвесь час трэба пацвярджаць такую пазіцыю сваёй працай і той прадукцыяй, якую будзе выпускаць прадпрыемства. Час не стаіць на месцы. Кіраўнікі гэтак жа змяняюцца, як і працоўныя або служачыя. Калектыў МТЗ — каманда, якая можа вырашаць любыя задачы.




***Матэрыял падрыхтавала Н. С. Міхалёва***


З Днём маці












МАМА






МАМА

## Адзіны дзень прафілактыкі
## “Твая бяспека ў тваіх руках”






## Школьная акцыя «Искусство жить»





*Искуство жить — значит быть любимым. Он жил или она жила — это значит только одно: его или её много любили. Жизнь не в том, чтобы жить, а в том, чтобы чувствовать, что живёшь.*

*Искусство жить — это высокая степень умения, мастерство в действии, в любой сфере жизнедеятельности; стремление к достижению успеха во всём интересующем и приносящем пользу; любовь к родным и близким, любовь к природе и ко всему доброму. Ведь в сердце, слабом от любви, нельзя предполагать спокойствие и твёрдость.*

***Старонку падрыхтавала Вольга Жук***
***Фота Ірыны Маркевіч***

# Кастрычніцкі аб'ектыў






ДУА "Сярэдняя школа № 2 горада Беразіно"
223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by
Сайт школы
berezino2.school.by

Газета "Школьная планета" выходзіць адзін раз у месяц.
Творчы калектыў клуба "Юны журналіст": Дудко Аляксандра, Жук Вольга, Вайцяховіч Лізавета, Власюк Марыя, Маркевіч Ірына




